УДК 821.161.3:82–92 В. Зуёнак

**Вобраз Васіля Зуёнка ў інтэрв’ю 2000-х гг.: спецыфіка прэзентацыі**

**Н. В. Заяц**

**An image of Vasily Zuenok in the interviews of 2000s: the specifics of the presentation**

**N. V. Zayats**

У артыкуле на матэрыяле інтэрв’ю 2000-х гг. у літаратурна-мастацкіх выданнях паказваецца спецыфіка прэзентацыі вобраза беларускага паэта В. Зуёнка. Акрэсліваецца праблемна-тэматычны дыяпазон, выяўляецца жанравая адметнасць інтэрв’ю.

The article based on the interviews published in the literary magazines in 2000s shows the presentation specifics of Belarusian poet Vasily Zuenok’s image. It’s outlining the problem-thematic range, reveling the genre characteristics of the interviews.

Інтэрв’ю з пісьменнікам – найбольш прыдатная форма для артыкулявання яго светапоглядных і літаратурных установак (акрамя, зразумела, мастацкіх твораў). Так, размовы з яркім прадстаўніком філагічнага пакалення Васілём Зуёнкам, апублікаваныя ў часопісах “Роднае слова” і “Маладосць”, газеце “Літаратура і мастацтва”, на сайце “Радыё Свабода”, якія паслужылі аб’ектам аналізу, выступаюць крыніцай звестак пра час і пра сябе ў часе, раскрываюць розныя іпастасі яго творчай асобы. Інфармацыя, агучаная ў інтэрв’ю, мае каштоўнасць для выкладчыкаў беларускай літаратуры: эксклюзіўныя факты біяграфіі, успаміны пра класікаў, выказванні ад першай асобы могуць садзейнічаць павышэнню цікавасці навучэнцаў да творчасці В. Зуёнка, спрыяць актывізацыі іх працы на занятках.

Гутаркі прысвечаны пераважна прафесійным пытанням: В. Зуёнак пазіцыянуе сябе перадусім як пісьменнік, амаль не закранаючы “асабістых” тэм. Разам з тым ён вельмі шчыры з суразмоўцам і чытачом, калі гаворка ідзе пра мастацкую творчасць – у інтэрв’ю прысутнічаюць спавядальныя інтанацыі. В. Зуёнак раскрываецца не толькі як паэт, але і як літаратуразнавец, крытык, філолаг. Аднак, па яго прызнанні, увесь яго разнапланавы досвед падпарадкаваны адзінай мэце: “Усе гэтыя “іпастасі” <…> няблага стасуюцца з творчасцю паэтычнай: дазваляюць зірнуць на яе з плацдармаў іншых творчых індывідуальнасцяў, трымаць сваю музу ў форме, на хвалі літаратурных працэсаў і спасціжэнняў” [4, с. 99]. Прыярытэты пісьменніка выяўляюцца і ў частаце абмеркавання тых ці іншых тэм: большасць інтэрв’ю прысвечана т.зв. праблеме мастака і мастацтва, сутнасці паэтычнай працы. “Паэзія – і гэта не патрабуе асаблівых доказаў – далёка не загадзя “размеркаваны” набор (ці падбор) слоў і радкоў, “у рыфму” ці без яе. Паэтычны твор – з’ява разавая, невыпадкова ж сказана: “Вершы не пішуцца – здараюцца”… Паэзія не падлеглая “вымярэнню”. Яна, як гэта ні дзіўна можа прагучаць, вышэй і глыбей

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сказанага словам” [5, с. 110], – фармулюе сваё разуменне паэзіі як нечага сакральнага В. Зуёнак у інтэрв’ю 2015 г., пацвярджаючы агучаную і раней думку:“Паэзія не прадаецца, бо гэта – душа” [2, с. 6]. Гэта ўсведамленне прадвызначае высокую мастацка-эсэтычную якасць Зуёнкавага літаратурнага плёну, патрабавальнасць да сябе і да іншых, катэгарычнасць у ацэнках: “З паэзіяй “разбірацца” можна толькі такім спосабам: ёсць яна альбо яе няма. Ці, бывае, яна падмяняецца абманлівай “мімікрыяй”, – у розных праявах: ад дэманстратыўнай “прастакаватасці” – з “аздобай” “вулічнага” лексікону да такой жа – дэманстратыўнай – “ускладнёнасці”, дзе і сам аўтар іншы раз клёку не дапытаецца…” [5, с. 110]. Працытаваныя радкі ўтрымліваюць адначасова і “практычны голас чытача, спажыўца сённяшняй вершаванай прадукцыі” [5, с. 110], і погляд вопытнага аўтара, і меркаванне спрактыкаванага рэдактара. Доўгі час В. Зуёнак быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса “Маладосць” (1966–1972), галоўным рэдактарам часопісаў “Бярозка” (1972–78) і “Маладосць” (1978–82).

Як рэдактар В. Зуёнак “загартаваны” ў супрацоўніцтве з многімі выдатнымі мастакамі слова. Так, падчас працы ў “Маладосці” В. Зуёнак цесна ўзаемадзейнічаў з У. Караткевічам: “Працавалася з Уладзімірам Караткевічам лёгка, нязмушана і… – няпроста. Веды ў яго былі фенаменальныя. Ён заўсёды быў, як гаворыцца, “у матэрыяле”, – як рыба ў вадзе. За кожнай дэталлю ці гістарычным штрышком стаялі горы назапашанага досведу, – такая непрыступная абарона. І паспрабуй яму запярэчыць ці ўсумніцца ў чым-небудзь. Ён тут жа ўсхопіцца: “А хочаш, я скажу табе зараз, які быў дзень: скаромны чацвер ці посная пятніца ці што іншае? – 20 верасня (умоўна кажучы) адна тысяча пяцьсот… пэўнага года, калі мой герой N. частаваўся ў гасцях у пана NN…” – і з, як здавалася, неабдымнай кішэні Караткевіча выходзіў на свет падобнай жа неабдымнасці і заслужанасці, пульхны, з неаднагадовай біяграфіяй, нататнік, а з яго нетраў – “вечны каляндарык” з пераможнай рэмаркай Уладзіміра Сямёнавіча: “От, пабач!..” [5, с. 108].

У гутарках 2000-х гг. В. Зуёнак паўстае і як чалавек, што доўгі час быў у авангардзе дзейнасці літаратарскай суполкі – Саюза пісьменнікаў Беларусі (з 1982 г. на пасадзе сакратара, у 1990–1998 – старшыні). У сувязі з успамінамі пра гэты этап біяграфіі тэматыка інтэрв’ю пашыраецца: пісьменнік разважае над праблемай сумяшчэння творчых і кіраўнічых функцый, над сутнасцю ўлады. “Улада – гэта спосаб самавыяўлення. І паколькі мне дадзеная Богам пэўная здольнасць самавыявіцца, сцвердзіць сваю існасць шляхам працы са словам, – то ўжо той, “уладны”, шлях дужа і не пагражаў мне, быў для мяне істотна нецікавы, не прыцягальны, не заманлівы, як бы “чужы” [2, с. 6]. Паказальна, што і гэта тэма разгортваецца ў спавядальным, асобасным рэчышчы: у інтэрв’ю не знойдзем пікантных падрабязнасцяў з жыцця вядомых калег па пяру, а за час працы ў Саюзе пісьменнікаў, верагодна, магло назбірацца нямала інфармацыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

падобнага гатунку. Немагчымасць такога спосабу камунікацыі з аўдыторыяй і прыцягнення ўвагі да сябе засведчана і ў паэтычных радках В. Зуёнка: “Мемуарыст не шыты лыкам – / Ён вырас курсам удвая: / Былі ўспаміны: “Я і Быкаў”, / А засталося ўрэшце: “Я…”[1]. Калі і згадваюцца “трэція асобы”, то часцей – з удзячнасцю і павагай, прынамсі, так гаворыць В. Зуёнак пра Навума Кісліка і, асабліва, пра Анатоля Вялюгіна, які пастаянна падтрымліваў маладога тады аўтара. У тым жа матэрыяле ён называе і калег, што бачацца яму ўзорам “паэта і грамадзяніна”: “Янка Брыль. Я яго вельмі шанаваў і як пісьменьніка, і як чалавека. Пімен Панчанка быў сьветлай асобай, бескампраміснай. Ён вельмі балюча ўспрымаў жыцьцё, але быў тым чалавекам, які даваў падсьветку іншым творцам” [3]. Такі падыход характарызуе як згаданых асоб, так і самога інтэрв’юанта.

Тактоўнасць і вытрыманасць пісьменніка выяўляюцца і ў яго палеміцы з апанентамі, у прыватнасці, з некаторымі літаратурнымі крытыкамі. “Калісьці засмуціла мяне прачытанне аднаго з маіх самых першых унёскаў у кнігу паэм – “Сялібы” – аўтарам манаграфіі (выдадзенай на аснове дысертацыі) “Шляхі паэтычнага эпасу” Л. Смальянавай, якая ўбачыла ў творы <…> тое, чаго ў ім няма ды і наогул не магло быць: “...у паэме Зуёнка “Сяліба” ёсць разгорнуты сюжэт, аб’ектывізаваныя вобразы інжынераў-меліяратараў (калі лічыць, то гэтакі “меліяратар” ды яшчэ “інжынер” там усяго адзін! – В. З.) – антыподаў па сваіх поглядах і практычнай дзейнасці, канфлікт паміж якімі і складае змест твора” [4, с. 97], – уносіць неабходныя тлумачэнні В. Зуёнак. У дадзеным выпадку ацэнка твора і рэкамендацыі аўтару засноўваліся не на літаратурным матэрыяле, а на гіпотэзе крытыка, што патрабаваў ад паэта глыбокай распрацоўкі характараў тых герояў, якіх увогуле ў творы няма: персанажаў, надзеленых “прафесіяй меліяратараў, прафесіяй, якая сёння ў нашай рэспубліцы з’яўляецца адной з важнейшых у сувязі з разгортваннем меліярацыйных работ у адпаведнасці з планам развіцця народнай гаспадаркі” [Цыт. па: 4, с. 97]. Думаецца, рэмаркі ад першай асобы засцерагуць даследчыкаў пісьменніцкага плёну В. Зуёнка ад суб’ектывізму ў трактоўках і ацэнках, дапамогуць зрабіць больш-менш дакладную літаратуразнаўчую інтэрпрэтацыю аўтарскіх інтэнцый.

“Прафесійная” тэматыка інтэрв’ю, аднак, звужае патэнцыяльную аўдыторыю чытачоў: разважанні ўяўляюць каштоўнасць найперш для людзей з філалагічнага асяродку, літаратуразнаўцаў, аматараў паэтычнай творчасці і пад. Цікавасць для шырокага кола людзей, у тым ліку – для школьнікаў, можа ўяўляць, напрыклад, інтэрв’ю М. Скоблы “Чаму касманаўт Кавалёнак ня стаў прэзыдэнтам Беларусі”. Размова ідзе пра нетрывіяльны эпізод у творчай біяграфіі В. Зуёнка і ў гісторыі нацыянальнай літаратуры, калі ў 1978 г. падчас сеансу сувязі з арбітальнай станцыяй “Саюз-6” гучалі вершы з кнігі В. Зуёнка

[1] Цытуецца па рукапісе В. Зуёнка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Нача”. “Факт гэты, – успамінае паэт, – засьведчылі ўсе касьмічныя рэпартажы, якія ў той час перадаваліся па радыё, тэлебачаньні, друкаваліся ў газэтах (я помню інфармацыю ў “Известиях”). Памятаю тэлекадры, дзе Кавалёнак проста на арбіце чытае вершы з кнігі “Нача” свайму касьмічнаму спадарожніку Іванчэнкаву і нават перакладае зь беларускай на расейскую. Пасьля прызямленьня, як гаварыў мне сам Уладзімер Васілевіч, ён той асобнік кнігі здаў у тагачасны маскоўскі Музэй Кастрычніцкай рэвалюцыі” [6]. Дарэчы, палёт Зуёнкавай кнігі ў космас паслужыў “матэрыялам” для сяброўскай эпіграмы Р. Барадуліна: “В. Зуёнак рыфму чуў з пялёнак, / І зямляк Зуёнкаў – / Кавалёнак / Лётаў доўга ў космасе, / Няйначай, / Зачытаўся Васілёвай “Начай” [1, с. 80].

Калі зместам інтэрв’ю з’яўляюцца пераважна прафесійныя пытанні, то ў дачыненні да формы можна гаварыць пра своеасаблівую “інтэржанравасць” гутарак з В. Зуёнкам. У іх суіснуюць элементы публіцыстыкі, мемуарыстыкі, эсэістыкі, літаратурнай крытыкі, што дазваляе адказам пісьменніка на асобныя пытанні аформіцца ў паўнавартасныя тэксты іншых жанраў. Гэта абумоўлена як агульнай тэндэнцыяй да размывання жанравых межаў, так і асаблівасцямі аўтарскай манеры В. Зуёнка, уся творчасць якога (лірыка з адзнакамі эпасу, ліра-эпічныя творы, лірычная проза, эсэістыка) пазначанна імкненнем да родава-жанравага сінкрэтызму.

Такім чынам, інтэрв’ю з В. Зуёнкам утрымліваюць эксклюзіўныя звесткі пра асобу пісьменніка, разважанні пра сутнасць паэзіі ўвогуле і сучасную літаратурную сітуацыю ў прыватнасці, раскрываюць таямніцы творчай лабараторыі, перадаюць эмацыйны і практычны вопыт, атрыманы падчас працы рэдактарам і інш. Разгледжаныя інтэрв’ю могуць выкарыстоўвацца на занятках па беларускай літаратуры пры вывучэнні творчасці паэта ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі і ВНУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Барадулін, Р. Абразы без абразы : сяброўскія шаржы і эпіграмы / Р. Барадулін, К. Куксо. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 192 с.
2. Зуёнак, В. “Няма таго, што раньш было...” [гутарка Л. Галубовіча] / В. Зуёнак // ЛіМ. – 2002. – 20 верас. – С. 6–7.
3. Зуёнак, В. “Паэт ня знае несвабоды” [інтэрв’ю М. Скоблы] / В. Зуёнак // Радыё Свабода. – 2010. – 26 чэрв. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.svaboda.org/content/transcript/2082547.html. – Дата доступу : 28.04.2016.
4. Зуёнак, В. “Паэту насцеж адкрыты свет…” [інтэрв’ю Н. Заяц] / В. Зуёнак // Роднае слова. – 2003. – № 6. – С. 96–99.
5. Зуёнак, В. Тры весткі з маладосці [інтэрв’ю Н. Заяц] / В. Зуёнак // Маладосць. – 2015. – № 5. – С. 107–110.

6. Зуёнак, В. Чаму касманаўт Кавалёнак ня стаў прэзыдэнтам Беларусі [інтэрв'ю М. Скоблы] / В. Зуёнак // Радыё Свабода. – 2011. – 4 красав. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.svaboda.mobi/a/3557249.html. – Дата доступу : 28.04.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ